# ПРАДМОВА

Правядзенне бягучай і прамежкавай атэстацыі з'яўляецца неад'емнай часткай арганізацыі навучальнага працэсу на першай ступені агульнай сярэдняй адукацыі. Тэматычны кантроль праводзіцца з мэтай праверкі і ацэнкі засваення вучэбнага матэрыялу пэўнай тэмы. Пры ажыццяўленні тэматычнага кантролю ацэньваюцца дасягненні вучняў не па асобных элементах (як пры паўрочным кантролі), а ў лагічнай сістэме, якая адпавядае структуры вучэбнай тэмы (тэм).

Змешчаны ў дапаможніку матэрыял (у 2-х варыянтах) можна выкарыстоўваць не толькі для праверкі, але і для абагульнення і сістэматызацыі ведаў вучняў па асноўных тэмах, вывучаемых у 4-м класе. Па кожнай тэме прапанавана сістэма заданняў, якая забяспечвае праверку якасці авалодання вучнямі неабходнага матэрыялу. Заданні з'яўляюцца сродкам дыягностыкі і самадыягностыкі ступені засваення кожным вучнем функцыянальных сродкаў беларускай мовы. Перад кожнай праверачнай работай прапанаваны матэрыял для актывізацыі ведаў вучняў па тэмах. Пасля выканання праверачнай работы прадугледжана работа над памылкамі, якая накіравана на карэкцыю ведаў вучняў. У дапаможніку таксама змешчаны кантрольныя работы па тэмах «Сказ», «Назоўнік», «Прыметнік», «Дзеяслоў».

Ацэньванне работ праводзіцца згодна з нормамі ацэнкі вынікаў вучэбнай дзейнасці. Заданні складзены ў адпаведнасці з патрабаваннямі праграмы па беларускай мове для ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання і размеркаваны ў той жа паслядоўнасці, у якой ідзе вывучэнне тэм.

Неабходна адзначыць, што выкананне ўсіх работ гэтага дапаможніка не з'яўляецца абавязковым.

Работа са сшыткам спрыяе актывізацыі станоўчай матывацыі навучэнцаў, развіццю іх самастойнасці і ініцыятывы, аказвае дапамогу настаўніку ў павышэнні эфектыўнасці кантролю ведаў, уменняў і навыкаў, дапамагае арганізаваць індывідуальную работу з вучнямі на ўроку і самастойную работу дома. Для гэтага ў дапаможніку змешчаны адказы, якія можна прагледзець з дапамогай QR-кодаў.

# ПАЎТАРЭННЕ

## Успамінаем, паўтараем

Частка слова, якая стаіць перад коранем і служыць для ўтварэння слоў, — гэта **прыстаўка.**

Прыстаўкі ***аб-***, ***ад-***, ***над-***, ***пад-***, ***прад-***, ***перад-*** пішуцца нязменна: **надрэзаць**, **абсушыць.**

У прыстаўках ***з-/с-***, ***раз-/рас-***, ***без-/бес-***, ***уз-/ус-*** літара з пішацца перад звонкімі зычнымі, а літара ***с*** — перад глухімі зычнымі: разбіў, сцерці, узначаліў.

Калі апошняя літара прыстаўкі і першая літара кораня супадаюць, то пішуцца абедзве літары: бясстрашны, рассадзіць.

Калі корань заканчваецца на ***н***, а суфікс пачынаецца з гэтай літары, то пішуцца абедзве літары: сонны, каменны.

## Праверачная работа 1

### Варыянт 1

**1.** Ад дадзеных слоў пры дапамозе прыставак і суфіксаў утвары аднакаранёвыя словы. Выдзелі ў іх корань.

| Назоўнік | Прыметнік | Дзеяслоў |
|---|---|---|
| казка | | |
| | працоўны | |
| | | замарозіць |

**2.** Падбяры да слоў аднакаранёвыя антонімы. Выдзелі ў іх прыстаўкі.

*Узор: убягаць —* ***падбягаць.***

Прылятаць — ________________, закапаць — ________________, адключыць — ________________, падступіць — ________________.

**3.** Прачытай. Закрэслі лішнюю літару ў дужках.

Бе(*с*, *з*)білетны, у(*с*, *з*)капаць, ра(*с*, *з*)клеіла, (*с*, *з*)будаваў.

**4.** Падкрэслі словы, якія запісаны правільна.

Бяснежная, аббегаў, расфарбаваць, бясстрашны.

**5.** Устаў літары ***н***, ***нн***.

Сасо_____ік, бярэз_____ік, каме_____ы, сі_____і.

## Варыянт 2

**1.** Ад дадзеных слоў пры дапамозе прыставак і суфіксаў утвары аднакаранёвыя словы. Выдзелі ў іх корань.

| Назоўнік | Прыметнік | Дзеяслоў |
|---|---|---|
| звон | | |
| | шумны | |
| | | пасадзіць |

**2.** Падбяры да слоў аднакаранёвыя антонімы. Выдзелі ў іх прыстаўкі.

*Узор:* ***прылятаць — адлятаць.***

Закрываць — ______________, адцвітаць — ______________, адступаць — ______________, прынёс — ______________.

**3.** Прачытай. Закрэслі лішнюю літару ў дужках.

Ра(*с*, *з*)прануўся, бя(*с*, *з*)воблачны, бе(*с*, *з*)вынікоўы, у(*с*, *з*)горак.

**4.** Падкрэслі словы, якія запісаны правільна.

Бесспамылковы, беспарадак, бяззубы, рассмяшыў.

**5.** Устаў літары ***н***, ***нн***.

Малі____ік, фабрыч____ы, асе____і, адваж____ы.

# Работа над памылкамі

## Правапіс прыстаўкі.

**1.** Запішы слова правільна. Запішы яшчэ тры словы з дадзенай прыстаўкай. Вызначы прыстаўку.

*Узор:* ***спявала, злез, разгарнула.***

______________________________________________

## Правапіс падвоенных літар на стыку прыстаўкі і кораня, кораня і суфікса.

**2.** Запішы слова правільна. Запішы яшчэ тры словы з дадзенай прыстаўкай і коранем. Вызначы прыстаўку і корань.

*Узор:* ***раззлаваўся, аддаў, рассмяяўся.***

______________________________________________

# ТЭКСТ

## Тыпы тэкстаў

### *Праверачная работа 1*

*Варыянт 1*

**1.** Прачытай. Падзялі тэкст на сказы. Вызначы колькасць сказаў у тэксце. Дай тэксту загаловак.

____________________________________

Я ўбачыў птушку у яе была маленькая галава на доўгай шыі на галаве тырчалі ззаду пучкі пер'я яны былі падобныя на чорныя рожкі ці вушкі вакол шыі тапырыўся каўнер рыжага колеру шчокі, шыя і ніжняя частка тулава былі белыя спіна ў птушкі бурая пляскатыя лапы былі без плавацельных перапонак шырокія пальцы птушкі нібы абшыты скуранымі шматкамі гэта была чомга. (*Паводле В. Вольскага.*)

У тэксце _____ сказаў.

Вызначы тып тэксту: ☐ апавяданне ☐ разважанне ☐ апісанне

**2.** Прачытай сказы. Пранумаруй іх у патрэбнай паслядоўнасці, каб атрымаўся тэкст. Дай тэксту загаловак.

____________________________________

☐ Па-першае, робяць цэглу з гліны і пяску.
☐ Шмат гадоў таму з цэглы будавалі палацы.
☐ Да таго ж у цагляным доме зімой цёпла, а летам прахалода.
☐ Чым жа ўсім так спадабаецца цэгла?
☐ Па-другое, цэгла не гарыць, не баіцца вады.
☐ Таму ў свеце так шмат цагляных дамоў.
☐ Па-трэцяе, у самы моцны мароз цэгла не трэскаецца.
☐ А яны ёсць паўсюды пад рукой.

Вызначы тып тэксту: ☐ апавяданне ☐ разважанне ☐ апісанне

**3.** Прачытай. Падзялі тэкст на часткі.

Кошка і вавёрка

У дзяцей была кошка Мурка. У Муркі былі кацяняты. Раптам яны загінулі. Кошка вельмі сумавала па кацянятам. Аднойчы хлопчыкі знайшлі ў лесе маленькую вавёрачку і прынеслі яе

дамоў. Яны паклалі вавёрачку каля кошкі. Мурка абнюхала вавёрачку, затым палізала яе і пачала карміць. Так кошка вырасціла вавёрку. Мурка нават вучыла яе лавіць мышэй. Але ў вавёркі гэта ніяк не атрымлівалася.

Складзі план пераказу тэксту. Запішы яго.

План

1) ____________________

2) ____________________

3) ____________________

4) ____________________

**4.** Прачытай. Абазнач паслядоўнасць частак тэксту. Дай тэксту загаловак.

____________________

☐ Хлопчык узяў на рукі напалоханага зайчыка. Ён аднёс яго ў лес і выпусціў на волю.

☐ Летам Міколка прыехаў у вёску да бабулі і дзядулі.

☐ Хлопчык падбег да месца здарэння. Там пад каршуном танюсенька, як дзіця, пішчаў зайчык. Міколка прарэзліва закрычаў і кінуўся на дапамогу. Ён пачаў махаць рукамі, бегаць вакол драпежніка. Каршун незадаволена ўзмахнуў шырокімі крыламі і адляцеў.

☐ Аднойчы хлопчык ішоў уздоўж поля. Раптам нейкая вялікая птушка ўпала на зямлю. Пад ёй штосьці затрапяталася жывое.

Вызначы тып тэксту: ☐ апавяданне ☐ разважанне ☐ апісанне

**5.** Злучы стрэлкамі.

| | |
|---|---|
| Тэкст-апісанне | тлумачыцца, даказваецца штосьці; гаворыцца пра прычыны падзей і з'яў |
| Тэкст-разважанне | расказваецца пра дзеянні і падзеі, што ідуць адно за адным |
| Тэкст-апавяданне | апісваюцца прадметы, людзі, жывёлы, малюнкі прыроды |

**2.** Дапішы канчаткі назоўнікаў множнага ліку. Вызначы іх склон.

Уцякаў ад ваўк_____ (__. скл.), плылі па рэк_____ (__. скл.), пайшла з вучн____ (__. скл.), дары сад____ (__. скл.).

**3.** Прачытай. Падкрэслі спалучэнні слоў з назоўнікамі множнага ліку ў давальным склоне.

Задаволены падарункамі, падарыла сынам, прыгласіла сяброў, спадабалася дзецям, пахнуць кветкамі, засумавала па сястрычках.

**4.** Запішы назоўнікі множнага ліку ў форме роднага склону. Абазнач іх канчаткі.

Каты — _____________, вучаніцы — ______________, далоні — __________________, алоўкі — _________________.

**5.** Перакладзі спалучэнні слоў на беларускую мову. Абазнач зверху склон назоўнікаў множнага ліку.

Угостил мальчиков — ________________________________,

играла с девочками — ________________________________,

урожай огурцов — ___________________________________,

разложил по тарелкам — _______________________________.

## *Работа над памылкамі*

______________________________________________________

______________________________________________________

______________________________________________________

## *Кантрольная работа 1*

*Варыянт 1*

**1.** Падкрэслі лішняе па тыпе скланення слова.

Сонца, школа, возера, вучань, рукзак.

**2.** Запішы назоўнікі 1-га скланення ў творным склоне.

Трава — ______________, кашуля — _________________, рака — _____________, мара — __________________.

**3.** Выправі, дзе трэба, памылкі ў напісанні канчаткаў назоўнікаў 1-га скланення адзіночнага ліку ў давальным і месным склонах.

Таполі, чарапахе, жабі, наге, пчале, Галі.

**4.** Адзнач знакам «+» назоўнікі мужчынскага роду 2-га скланення, якія правільна запісаны ў родным склоне.

☐ цукру, ☐ саду, ☐ сябра, ☐ ветру.

**5.** Дапішы канчаткі назоўнікаў множнага ліку. Абазнач склон гэтых назоўнікаў.

Спявае лета над бар_______ (__. скл.),
Сасонк__ (__. скл.) струнамі звіняць.
Гамоніць поле калас_______ (__. скл.).
Шапоча ў кветк_____ (__. скл.) сенажаць.

*П. Броўка*

## Варыянт 2

**1.** Падкрэслі лішняе па тыпе скланення слова.

Вясёлка, надвор'е, цыпляня, парта, краіна.

**2.** Запішы назоўнікі 1-га скланення ў творным склоне.

Воля — _________________, чаромха — _________________, галава — _________________, дарога — _______________________.

**3.** Выправі, дзе трэба, памылкі ў напісанні канчаткаў назоўнікаў 1-га скланення адзіночнага ліку ў давальным і месным склонах.

Сасне, зязюле, Сашэ, падлозе, раслінi, пшаніцы.

**4.** Адзнач знакам «+» назоўнікі мужчынскага роду 2-га скланення, якія правільна запісаны ў родным склоне.

☐ ветра, ☐ месяца, ☐ мядзведзя, ☐ грому.

**5.** Дапішы канчаткі назоўнікаў множнага ліку. Абазнач склон гэтых назоўнікаў.

Льюцца песні жавароначк_____ (__. скл.)
Над прастор_______ (__. скл.) пал_____ (__. скл.),
І даносіцца тужлівае
Развітанне жураўл_____ (__. скл.).

*В. Жуковіч*

# ЗМЕСТ


ПРАДМОВА .......................... 3

ПАЎТАРЭННЕ

Праверачная работа 1 .......... 4
*Варыянт 1* .......................... 4
*Варыянт 2* .......................... 5
Работа над памылкамі ......... 5

ТЭКСТ

Тыпы тэкстаў

Праверачная работа 1 .......... 6
*Варыянт 1* .......................... 6
*Варыянт 2* .......................... 8

СКАЗ

Аднародныя члены сказа. Знакі прыпынку ў сказах з аднароднымі членамі

Праверачная работа 1 ........ 10
*Варыянт 1* ........................ 10
*Варыянт 2* ........................ 12
Работа над памылкамі ....... 13
Кантрольная работа 1 ........ 13
*Варыянт 1* ........................ 13
*Варыянт 2* ........................ 14

СКЛАД СЛОВА

Аснова слова

Праверачная работа 1 ........ 16
*Варыянт 1* ........................ 16
*Варыянт 2* ........................ 17

НАЗОЎНІК

Змяненне назоўнікаў па склонах

Праверачная работа 1 ........ 18
*Варыянт 1* ........................ 18
*Варыянт 2* ........................ 19

Тры скланенні назоўнікаў. Назоўнікі 1-га скланення, іх канчаткі

Праверачная работа 2 ........ 21
*Варыянт 1* ........................ 21
*Варыянт 2* ........................ 21
Работа над памылкамі ........... 22

Назоўнікі 2-га скланення, іх канчаткі

Праверачная работа 3 ............ 23
*Варыянт 1* ............................ 23
*Варыянт 2* ............................ 24
Работа над памылкамі ........... 25

Назоўнікі 3-га скланення, іх канчаткі

Праверачная работа 4 ............ 26
*Варыянт 1* ............................ 26
*Варыянт 2* ............................ 27
Работа над памылкамі ........... 28

Скланенне назоўнікаў у множным ліку

Праверачная работа 5 ............ 28
*Варыянт 1* ............................ 28
*Варыянт 2* ............................ 29
Работа над памылкамі ........... 30
Кантрольная работа 1 ............ 30
*Варыянт 1* ............................ 30
*Варыянт 2* ............................ 32

ПРЫМЕТНІК

Змяненне прыметнікаў па родах, ліках

Праверачная работа 1 ............ 32
*Варыянт 1* ............................ 32
*Варыянт 2* ............................ 33
Работа над памылкамі ........... 34

Змяненне прыметнікаў па склонах

Праверачная работа 2 ............ 35
*Варыянт 1* ............................ 35
*Варыянт 2* ............................ 36
Работа над памылкамі ........... 36

Скланенне прыметнікаў множнага ліку

Праверачная работа 3 ............ 37
*Варыянт 1* ............................ 37
*Варыянт 2* ............................ 38

Работа над памылкамі ....... 39
Кантрольная работа 1 ........ 39
*Варыянт 1* ........................ 39
*Варыянт 2* ........................ 40
Работа над памылкамі ....... 40

**ЗАЙМЕННІК**

**Займеннікі 1, 2, 3-й асобы адзіночнага і множнагу ліку. Скланенне займеннікаў**

Праверачная работа 1 ........ 41
*Варыянт 1* ........................ 41
*Варыянт 2* ........................ 42
Работа над памылкамі ....... 43

**ДЗЕЯСЛОЎ**

**Змяненне дзеясловаў па часах і ліках. Змяненне дзеясловаў прошлага часу па родах. Правапіс дзеясловаў на *-ся, -цца***

Праверачная работа 1 ........ 44
*Варыянт 1* ........................ 44
*Варыянт 2* ........................ 45
Работа над памылкамі ....... 46

**Змяненне дзеясловаў цяперашняга і будучага часу па асобах і ліках (спражэнне). Першае і другое спражэнне дзеясловаў. Канчаткі дзеясловаў 1-й асобы адзіночнага ліку I і II спражэння. Канчаткі дзеясловаў 3-й асобы множнага ліку I і II спражэння**

Праверачная работа 2 ........ 47
*Варыянт 1* ........................ 47
*Варыянт 2* ........................ 48
Работа над памылкамі ....... 49

**Канчаткі дзеясловаў 1-й асобы множнага ліку I і II спражэння. Канчаткі дзеясловаў 2-й асобы адзіночнага і множнага ліку I і II спражэння. Канчаткі дзеясловаў 3-й асобы адзіночнага ліку I і II спражэння**

Праверачная работа 3 ............ 49
*Варыянт 1* ............................ 49
*Варыянт 2* ............................ 50
Работа над памылкамі ........... 51
Кантрольная работа 1 ........... 51
*Варыянт 1* ............................ 51
*Варыянт 2* ............................ 52
Работа над памылкамі ........... 52

**АДКАЗЫ** ............................. 53